INTERNATIONAL BACCALAUREATE
BACCALAURÉAT INTERNATIONAL
BACHILLERATO INTERNACIONAL

**BELARUSSIAN A1 – STANDARD LEVEL – PAPER 1**
**BIÉLORUSSE A1 – NIVEAU MOYEN – ÉPREUVE 1**
**BIELORRUSO A1 – NIVEL MEDIO – PRUEBA 1**

Thursday 17 May 2001 (afternoon)
Jeudi 17 mai 2001 (après-midi)
Jueves 17 de mayo de 2001 (tarde)

1 hour 30 minutes / 1 heure 30 minutes / 1 hora 30 minutos

---

INSTRUCTIONS TO CANDIDATES

- Do not open this examination paper until instructed to do so.
- Write a commentary on one passage only. It is not compulsory for you to respond directly to the guiding questions provided. However, you may use them if you wish.

INSTRUCTIONS DESTINÉES AUX CANDIDATS

- Ne pas ouvrir cette épreuve avant d'y être autorisé.
- Rédiger un commentaire sur un seul des passages. Le commentaire ne doit pas nécessairement répondre aux questions d'orientation fournies. Vous pouvez toutefois les utiliser si vous le désirez.

INSTRUCCIONES PARA LOS ALUMNOS

- No abra esta prueba hasta que se lo autoricen.
- Escriba un comentario sobre un solo fragmento. No es obligatorio responder directamente a las preguntas que se ofrecen a modo de guía. Sin embargo, puede usarlas si lo desea.

Напішыце каментарый на адзін з наступных тэкстаў:

**1.** (a)

Дадому на адведзіны ці, мо праўдзівей будзе, - на развітанне Сымон Чачотка прыехаў з невялікага, калісьці нямецкага, а цяпер польскага курортнага гарадка на беразе Балтыцкага мора.

Яму бралася пад восемдзесят, і покуль засталіся такія-сякія сілы, можна было зірнуць на ўнукаў і на сваю вёску, якую не раз бачыў у снах, прайсці родным полем, пастаяць на кладцы над чыстаю з залаціста-пясчаным дном рэчачкаю.

Сымон напісаў дачцэ, што ужо выйшаўшы замуж, жыла ў вёсцы у новай хаце, а старую, хутаранскую, разабрала на хлеў, - што ён нарэшце маецца прыехаць у адведкі.

У першую ноч пасля шчодрага частавання - Сымон у чарку не зазірае даўно - ён дачцэ спаць не даў. Яна сядзела на табурэце пры яго ложку і, склаушы рукі на каленях, пераказвала яму, хто жывы, хто памёр, а Сымон усё распытваў.

Прачнуўся ён ад тупату ног і шоргату патэльні на прыпеку. Шыпела яечня і пахла выхаджанымі пухкімі аладкамі. Але Сымон толькі прыгубіў чарку. Выйшау з хаты і, каб ні з кім не страчацца, наўпроста, чужымі гародамі спусціўся да рэчкі, як помніў, туды, дзе даўней пры тоўстых алешынах ляжала кладка. Але і знаку не было, што сюды бегла сцежка, што тут раслі алешыны з дзвюма прывязанымі да іх гонкімі сасновымі жэрдкамі. Пры беразе ружавелі толькі нізкія пні. Крыўда апякала сэрца, што няма тых шурпатых чорных алешын.Залаціста-ліловая лента вады ў рэчцы, што бруілася пад карчамі, была здаецца тая ж самая, але толькі наўкруга ўсе выдавала новым і незнаёмым

-Усё меняецца,усё, - у рытм сваёй хадзе думаў Сымон, паволі падбіраючыся да абгладжанага, як бохан хлеба, пагорка з ружова-сіневатым ад маладога коласа высокім жытам. А за ім калматаю грываю падымаўся блакітна-зялены, завешаны празрыстаю, як газавая хустка, сінечаю малады хвойнік.

-Няўжо на маім полі высадзілі новы лес? Няўжо? І чаму ж нічога не сказала дачка? Але што ёй. Яна ўжо звыклася з новым лесам і без яго не можа ўжо ўявіць тутэйшыя мясціны. Але як я знайду сваё поле?

Яму хацелася рассунуць гэты густы прысадзісты, яшчэ не ацярэблены хвойнік, убачыць гарыстае поле, зяленую мяжу ў агністых кветачках палявога сардэчніку (гваздзікоў), пляскаты, рассечаны маланкаю камень на ёй, што віднеўся здалёк, як абломак вежы ці якога замка.

Нават не адводзячы калюча-яршыстых лап з залацістымі свечкамі новых пасынкаў, Сымон пашыўся ў шчытны хвойнік. Нібы апечаныя крапівою, пачалі гарэць паколатыя рукі, якімі ён засланяў твар і вочы. Камень, як помнілася Сымону павінен быў стаяць ніжэй.

"Няўжо няма яго, няўжо не засталося ніякага знаку, што тут было маё роднае поле?"

Але пляскатага, расколатага перуном каменя нідзе не было. Сымон спыніўся і ўпоперак густых пасадак, зноў закрываючыся локцем, раптам выйшаў на яго. Камень , як што жывое, даўно чаканае і жаданае, велічна заружавеў перад Сымонам. Той самы пляскаты, адсечаны з аднаго боку, нібы сякераю, востры, падобны да нарога ў плузе, родны камень. Сымон прыкленчыў і з цяжкім

уздыхам хацеў абняць гэту вечна маўклівую глыбу, але рукі не сцягвалі - камень быў шырэйшы.

-Ты жывы? Ты адзін тут помніш мяне. Бо ўтаміўшыся на жніве ці на ворыве, я ішоў і адпачываў каля цябе, - Сымон гаварыў у голас,бо ведаў,што ніхто яго не чуе.

Ён паляпаў па камені рукою, як пяшчотна ляпаюць па шыі цягавітага і любага каня: "Ці ведаеш ты, што я прайшоў паўсвету, каб нарэшце вярнуцца сюды і развітацца з табою. Не, мусіць не ведаеш, бо маўчыш. А мы паўвека не бачыліся. Ты нават мне сніўся, як сніцца хлопцу любая дзяўчына."

У мроіве калыхаўся, мігцеў свет - на вочы Сымону зноў высачыліся слёзы. Не то ад ветру, не то ад шкадавання да самаго сябе. І ён не выціраў іх, пякучых і салёных, а толькі злізваў языком,калі яны дабегалі да губ.

"Дзе тое ўсё дзелася? Застаўся толькі адзін нязрушаны камень. Няўжо толькі ён?

Вячаслау Адамчык. "Нязрушаны камень". 2000

– Ці з'яўляецца, на ваш погляд, сустрэча лірычнага героя з родным полем сваеасаблівай кульмінацыяй яго адзіноты і тугі па роднаму краю?

– Якія лінгвістычныя сродкі ўжывае В.Адамчык, каб перадаць глыбіню пачуццяў свайго лірычнага героя?

– Якую ролю адыгрывае персаніфікацыя каменя і падкрэсліванне яго нязрушаннасці?

– Яко ўражанне зрабіў на вас гэты тэкст і чаму?

**1.** (b)

Да скону б
Я шчаслівы быў бясконца,
Каб на зямлі для ўсіх хапала сонца,
Каб кожнаму аддадзена была
Яго часцінка дзеннага цяпла,
Каб ні на міг
Ні па чыім хаценні
Нідзе
Святла не засланялі цені.

Ды не бывае шчасця без памаркі.
І ўжо на неба
Выплываюць хмаркі,
І вецер іх збірае ў чараду,
Пагрозна гоніць цемную граду,
І ўсе вакол імгненна спахмурнела,
І прыцемак насунуўся нясмела…

Чым я магу святлу дапамагчы,
Як адвяду халодны цень начы ?
Ні ветру і ні хмар я не ўтаймую,
Да сонца не знайду сцягу прамую-
Хіба што промень выпадковы
Схаваю ў выпакутваныя словы,
Каб перад тым,
Як грукне ў дзверы смерць,
Хаця б адну душу паспець сагрэць…

Генадзь Бураўкін. “Жураўліная пара”. 2000

– Чаму гэты верш з’ яўляецца сваеасаблівай споведзю паэта ?

– Як структура верша дапамагае падкрэсліць галоўную думку аўтара ?

– Якія лінгвістычныя сродкі ўжываюцца паэтам для стварэння пачуцця шчырасці і самаадданасці свайму народу ?

– Якія пачуцці абудзіў у вас гэты верш ?